**КЛІКУ́Н**, Клікусь, дарожны дух, нязлосны, хоць з выгляду і грозны. Беларусы ўяўлялі яго худым веліканам, у абарваным балахоне з даўжэзнымі рукамі і такімі ж валасамі на галаве. У адной руцэ ў яго велізарная пуга з конскага воласа, а ў другой — залаты рог. З імі К. раз'язджае па дарогах удзень і ўночы на падуладным яму духу, які мае выгляд вялікай змяі і дзіўна, дзіка вішчыць. К., як і любы дух, нябачны, але яго можна пазнаць, калі ён праязджае, па пыле, які высока ўецца віхрам. Чалавек мусіць асцерагацца праехаць праз гэты віхор, каб не прагнявіць К., бо іначай той махне пугаю, блісне рогам, «гаркне выразна», і якое-небудзь няшчасце здарыцца з чалавекам. Уночы перамяшчэнне К. можна пазнаць па паху серы, які зыходзіць ад духа, які яго вязе. У народзе бытавалі выразы: «Каб цябе Клікун спаткаў!», «Клікун цябе вазьмі», «Клікун ты — збрахаў», «Як той Клікун, растрапаны, неўчасаны, абарваны, з пугай, і дындырue сабе па лесу, па бору, да па вялікаму шляху», «Трасца табе, Клікуну-брахуну». Імя К. сустракалася ў *замовах*, якія прамаўляліся на добрую дарогу.

*Літ.*: Древлянский П. [Шпилевский П.]. Белорусские народные поверья // Журн. М-ва нар. просвещения. 1852. Лит. прибавление №3.

*У. А. Васілевіч.*